Т. В. ШАЎКО
Баранавіцкі р-н, ДУА «Гарадзішчанская сярэдняя школа імя М. А. Скіпара »

АРГАНІЗАЦЫЯ НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ НАВУЧЭНЦАЎ ПА НЯМЕЦКАЙ МОВЕ

Апошні перыяд часу ў школьнай сістэме адукацыі значнае месца пачала займаць навукова-даследчая дзейнасць вучняў. Вучні, як сапраўдныя навукоўцы, выдзяляюць і робяць пастаноўку праблемы, г.зн. выбіраюць тэму даследавання, выказваюць гіпотэзу, праводзяць пошук і збор матэрыялаў, аналізуюць і абагульняюць атрыманыя дадзеныя, ажыццяўляюць падрыхтоўку і абарону выніковага прадукту. Зразумела, што такая работа не праходзіць без падтрымкі настаўніка. Настаўнік прапануе падумаць над тым ці іншым пытаннем (праблемай), сфармуляваць меркаванне, вызначыць мэту работы і акрэсліць задачы, скласці план работы. Так рабілі і мы.

У мінулым навучальным годзе да ўдзелу ў раённай навукова-практычнай канферэнцыі была прадстаўлена работа, у якой выяўляецца наяўнасць аднолькавых і падобных лексічных адзінак у нямецкай і беларускай мовах, вызначаецца крыніца іх паходжання.

На акалічнасць падабенства паміж многімі беларускімі і нямецкімі словамі я заўсёды звяртаю ўвагу вучняў амаль што з самых першых урокаў вывучэння імі нямецкай мовы. У IIIкласе вучні знаёмяцца з дзеясловаммalen, які лёгка параўноўваецца з адпаведным беларускім маляваць, далей сустракаюцца са словамі Ziegel – цэгла, Zwiebel – цыбуля, wandern - вандраваць, Pinsel – пэнзаль. У VII класе атрымліваюць першае заданне правесці параўнанне слоў з розных еўрапейскіх моў, практыкаванне “Sprachenvergleichen". У XI класе чытаюць тэкст „DeutscheEinflüsseimBelarussischen“, праз які атрымліваюць інфармацыю пра прычыны з’яўлення германізмаў у беларускай мове. Але, як паказала практыка, заўсёды не хапала нейкіх падрабязнасцяў і больш грунтоўных тлумачэнняў. Таму з цягам часу выспяла жаданне (у мяне, як настаўніка, і ў дапытлівых вучняў) знайсці больш пашыраныя звесткі, аформіць матэрыял у адзінае цэлае. У выніку работы быў складзены беларуска-нямецкі слоўнік аднолькавых і падобных лексічных адзінак, зроблена гістарычная даведка.

У слоўніку мы сабралі больш за 200 беларуска-нямецкіх слоў падобных па гучанню і з аднолькавым сэнсам, з дадатковым перакладам на рускую мову. Напрыклад: дрот –Draht (проволока) , бурштын - Bernstein(янтарь), вершы – Verse (стихи), клямка –Klinke (дверная ручка,

защёлка), панчохі – Bundschuh(чулки) і г. д. Слоўнік змяшчае лексіку практычна на кожную літару алфавіта і складаецца са слоў, якія ўваходзяць не толькі ў склад беларускай лексікі і занесены ў арфаграфічныя выданні, але з'яўляюцца характэрнымі для жывой гутаркі людзей і носяць рэгіянальны характар. На яго аснове можна ўбачыць, як трапіўшы ў беларускую мову, нямецкія словы адаптаваліся на фанетычным, марфалагічным, семантычным і словаўтваральным узроўнях.

У гістарычнай даведцы мы прыводзім факты, якія падцвярджаюць нашу гіпотэзу аб тым, што германізмы сталі неад'емнай, складаючай часткай беларускай мовы на этапе яе ўтварэння і станаўлення.Паказваем, што час з'яўлення першых носьбітаў з нямецкай моўнай кампанентай магчыма аднесці ў перыяд X ст. – пач. XIII ст., калі на нашых землях з'явіліся спачатку плямёны з Вісла-Одэрскага міжрэчча (літва і інш.), а затым перасяленцы з вострава Рюген. Звяртаем увагу на тое, што ўсе яны аселі на Навагрудскіх прасторах, а менавіта Навагрудчыну вучоныя называюць цэнтрам узнікнення беларускай мовы і беларускага этнасу, якая знаходзілася ў межах той дыялектнай зоны, якая была вядучай і вызначальнай у працэсе гэтага фарміравання (к. XIII – пач. XIV ст.) [1].

У рабоце мы даём тлумачэнне некаторых назваў дзяржаўных пасад і чынаў, якія выкарыстоўваліся на Беларусі і фіксуемадносна іх адпаведны нямецкі эквівалент: гетман - Hauptmann , канцлер – Kanzler, войт – Vogt. Звяртаем увагу на наяўнасць у нашай мове літары ў (нескладовае), якую можна вывесці з нямецкага дыфтонга "au", які чытаецца і вымаўляецца як "аў" (blau, schlau). І пры гэтым толькі ў беларускай мове захоўвае адпаведнае вымаўленне (у рускай, польскай і украінскай мовах ён пераходзіць у літару "в")[1]. Прыводзім прыклады з вуснай мовы, якія паказваюць шырокае прымяненне германізмаў у жывой гутарцы людзей, асабліва сталага ўзросту. Напрыклад, фортачка часта называецца люфцікам (ням. Luft азначае паветра), пасатыжы – абцэнгамі (ад ням. Zangeальбо дзеясловаў abziehen/abgezogen – сцягваць, здзіраць) і інш.

Захапляльным этапам работы стала параўнанне беларускіх слоў з лексічнымі адзінкамі некаторых еўрапейскіх моў. Для перакладу слоў з іспанскай мовы нават не спатрэбіліся слоўнікі, каб назваць значэнні такіх слоў як gusta, color, ganar, perlas, festa, postales і інш.Як не дзіўна, знайшліся таксама аднолькавыя лексічныя адзінкі ў англійскай мове: skin – скура, diamond – дыямант, colour – колер. Але зусім нечаканым аказаўся англійскі варыянт слова "нож перачынны", які некаторыя беларусы называць "сцізорык". Англійскае "scissors" так і перакладаецца "нож перачынны". Параўнанне з польскай мовай паказала, што ў гэтай мове існуюць тыя ж самыя германізмы, як і ў беларускай. Напрыклад: дыямант – diament, шыльда – szyld, бурштын – bursztyni інш.

Наяўнасць аднолькавых лексічных адзінак у шэрагу еўрапейскіх моў, у тым ліку беларускай і нямецкай, мы таксама тлумачым, зыходзячы з навуковых крыніц, якія былі нам даступныя. Прыводзім вытрымку з работы Выхота В.А., якая паказвае, што некаторыя беларускія і нямецкія словы ў аднолькавай ступені бяруць пачатак ад грэчаскай і лацінскай моў, узыходзяць да старажытнаіндыйскага і старажытнаславянскага корняў. Напрыклад, беларускае "руды", нямецкае „rot", гоцкае „raups", старажытнаславянскае „rudru", лацінскае „ruber", грэчаскае „erythros", старажытнаіндыйскае „rudhira" [2].

У рабоце мы змяшчаем дадаткі з цікавай, пазнавальнай інфармацыяй, якія прама ці ўскосна маюць дачыненне да тэмы работы. Напрыклад, узгадваем радкі з казкі А.С. Пушкіна пра цара Салтана, дзе апісваецца, як мяркуюць гісторыкі, вышэй пададзеная інфармацыя пра перасяленне людзей з вострава Рюген, які меў у свой час назвы Русін або Буян: "А теперь нам вышел срок, едем прямо на восток, мимо острова Буяна, в царство славного Салтана". Даём інфармацыю пра старажытных готаў, якія засялілі ў свой час не толькі ўсю Еўропу, але Паўночную і Сярэднюю Беларусь і якіх называюць агульным продкам германцаў, славян і балтаў. Адзначаем скандынаўскае паходжанне слова "Русь" і шмат іншага.

Матэрыял даследчай дзейнасці можа мець шырокую практычную значнасць і выкарыстоўвацца не толькі на ўроках нямецкай мовы, але і на ўроках беларускай мовы, гісторыі і інш.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Верас, В. У истоков исторической правды. Лингвистические исследования [Электронный ресурс]/ В. Верас. – Режим доступа: http://veras.jivebelarus.net/sodyerzhaniye/linhvistichyeskiye-isslyedovaniya. – Дата доступа: 15.02.2019.

2. Выхота, В. А. Нямецкая і беларуская лексіка, якая мае агульную крыніцу паходжання / В. А. Выхота // Народная асвета. – 1991. - № 9. – С. 49-53.